©  Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

## РТ–2018/2019 гг. Этап III

## Тэматычнае кансультаванне па беларускай мове

## Варыянт 2

| **Заданне.**<br>**Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| **А1.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы напісаны правільна:<br>1) Віцебская ***Вобласць***;<br>2) лясныя ***пралескі***;<br>3) планета ***Венера***;<br>4) аповесць ***«Насцечка»***;<br>5) вопытны ***Аграном***.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) *Віцебская* ***вобласць*** → назоўнік, які абазначае родавую назву адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, з’яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>2) *лясныя* ***пралескі*** → назоўнік, які абазначае назву расліны, з’яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>3) *планета* ***Венера*** → назоўнік, які абазначае назву астранамічнага аб’екта, з’яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>4) *аповесць* ***«Насцечка»*** → назоўнік, які абазначае назву літаратурнага твора, з’яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>5) *вопытны* ***аграном*** → назоўнік, які абазначае назву прафесіі, з’яўляецца агульным і пішацца з малой літары | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс агульных і ўласных назоўнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 18, 27 |
| **А2.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***а***:<br>1) галант_рэя;<br>2) ш_дэўр;<br>3) ц_гляны;<br>4) р_дканаселены;<br>5) шыр_кадаступны.<br><br>**Адказ:** 1,3 | 1) *галант**а**рэ́я* → запазычанае слова, у якім у адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем не пад націскам пішацца літара ***а***;<br>2) *ш**э**дэ́ўр* → пасля зацвярдзелага зычнага [***ш***] у сярэдзіне запазычанага слова і не пад націскам захоўваецца літара ***э***;<br>3) ***ц**а**гля́ны*** → спрадвечна беларускае слова, у якім не пад націскам гук [**э**] пераходзіць у гук [**а**], што і перадаецца на пісьме: *цэ́гла* – ***цагля́ны***; | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 34.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 4) *рэдканасе́лены* → у першай частцы складанага слова і не пад націскам захоўваецца літара ***э***;<br>5) *шыр**о**кадасту́пны* → націск падае не на першы склад другой часткі складанага слова, таму ў першай яго частцы пішацца літара ***о*** | | 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 26 |
| **А3.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:<br>1) жыцц_радасны;<br>2) ц_плыня;<br>3) персп_ктыва;<br>4) за_ц;<br>5) в_ршыня.<br><br>**Адказ:** 1,4,5 | 1) *жыцц**я**ра́дасны* → складанае слова, у якім пішацца злучальная літара ***я***, бо націск падае на першы склад другой яго часткі;<br>2) *ц**е**плыня́* → спрадвечна беларускае слова, у якім не ў першым пераднаціскным складзе пішацца літара ***е***;<br>3) *персп**е**кты́ва* → запазычанае слова, у якім незалежна ад месца націску пішацца літара ***е***;<br>4) *за́**я**ц* → спрадвечна беларускае слова, у суфіксе якога незалежна ад месца націску захоўваецца літара ***я***;<br>5) *в**я**ршы́ня* → спрадвечна беларускае слова, у якім у першым складзе перад націскам пішацца літара ***я*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 35.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А4.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы напісаны правільна:<br>1) вядомы ***ўніверсітэт***;<br>2) дзядзька ***Уладзімір***;<br>3) кароткі ***ўступ***;<br>4) ганаровы ***прэзідыўм***;<br>5) блакітны ***шолк***.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | 1) *вядомы **ўніверсітэт*** → пасля галоснага ў пачатку запазычанага слова не пад націскам пішацца літара ***ў*** (нескладовае);<br>2) *дзядзька **Уладзімір*** → у пачатку ўласнай назвы пішацца літара ***У*** (складовае) і пасля галоснага;<br>3) *кароткі **ўступ*** → пасля слова, якое заканчваецца на галосны, пішацца літара ***ў*** (нескладовае);<br>4) *ганаровы **прэзідыум*** → у запазычаным слове, якое заканчваецца на ***-ум***, пішацца літара ***у*** (складовае);<br>5) *блакітны **шоўк*** → слова, у якім адбылася замена зычнага гука [***л***] на зычны гук [***ў***] | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс ***у–ў*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |

| **Заданне.**<br>**Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| | (параўнайце ў рускай мове: ***шёлк***) | | |
| **А5.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць ***ь***:<br>1) мыш_;<br>2) прамен_чык;<br>3) дз_веры;<br>4) міл_ён;<br>5) голуб_.<br><br>**Адказ:** 2,4 | 1) *мыш* → пасля зацвярдзелага зычнага [***ш***] *мяккі знак* не пішацца;<br>2) *прамен**ь**чык* → у назоўніку, утваральная аснова якога заканчваецца на -***нь*** (*прамень*), перад памяншальна-ласкальным суфіксам -***чык***- пішацца *мяккі знак*;<br>3) *дзверы* → пасля зычнага [***дз'***] перад мяккім зычным [***в'***] *мяккі знак* не пішацца;<br>4) *міл**ь**ён* → у слове іншамоўнага паходжання пасля зычнага [***л'***] перад літарай ***ё***, што абазначае два гукі [***йо***], пішацца *раздзяляльны* ***ь***;<br>5) *голуб* → пасля губнога зычнага [***п***] ([*голуп*]) *мяккі знак* не пішацца | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс мяккага знака | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 5, 6.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |
| **А6.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) бястрашны;<br>2) раздолье;<br>3) замежжа;<br>4) каменны;<br>5) тэлеграма.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) *бя**сс**трашны* → спалучэнне аднолькавых зычных гукаў на стыку прыстаўкі і кораня перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***сс***);<br>2) *раздо**лле*** → падаўжэнне зычнага гука [***л'***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***лл***);<br>3) *заме**жжа*** → падаўжэнне зычнага гука [***ж***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***жж***);<br>4) *каме**нн**ы* → спалучэнне аднолькавых зычных гукаў на стыку кораня і суфікса перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***нн***);<br>5) *тэлегра**м**а* → у слове іншамоўнага паходжання падаўжэнне зычных гукаў не адбываецца і пішацца адна літара ***м*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Падоўжаныя зычныя, іх правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А7.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***с***:<br>1) нарэ_ка; | 1) *нарэзка* → аглушэнне пры вымаўленні ў сярэдзіне слова зычнага гука [***з***] перад глухім [***к***] на пісьме не перадаецца; | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 2) гу_чар;<br>3) ука_;<br>4) ра_чырванецца;<br>5) про_ьба.<br><br>**Адказ:** 4,5 | вымаўляем: [*нарэска*]; правяраем: *нарэзаць*; пішам: *нарэзка*;<br>2) *гу**ш**чар* → слова пішацца адпаведна з літаратурным вымаўленнем: [*гу**ш**чар*];<br>3) *ука**з*** → аглушэнне пры вымаўленні на канцы слова звонкага зычнага гука [***з***] на пісьме не перадаецца: вымаўляем – [*ука**с***]; правяраем: *ука**з**ы*; пішам: *ука**з***;<br>4) *ра**с**чырванецца* → прыпадабненне свісцячага зычнага гука [***с***] пры вымаўленні да шыпячага зычнага [***ч***] на пісьме ў прыстаўцы ***рас-*** не перадаецца; вымаўляем: [*ра**шч**ырван'эцца*]; пішам: *ра**с**чырванецца*;<br>5) *про**сь**ба* → азванчэнне зычнага гука [***с'***] пры вымаўленні перад звонкім [***б***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*про**з'**ба*]; правяраем: *пра**с**іць*; пішам: *про**сь**ба* | Зычныя гукі. Іх вымаўленне і правапіс.<br>Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных | беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 1, 2.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 16 |
| **А8.** Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць прыстаўку:<br>1) абараніць;<br>2) адмыслова;<br>3) выпяканне;<br>4) спагада;<br>5) упарадкаваны.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *абараніць* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***а-***; аднакаранёвыя словы: *бараніць, бараніцца*;<br>2) *адмыслова* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі; аднакаранёвыя словы: *адмысловы, адмысловасць*;<br>3) *выпяканне* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***вы-***; аднакаранёвыя словы: *пячы*, *печыва*;<br>4) *спагада* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі; аднакаранёвыя словы: *спагадаць, спагадлівы*;<br>5) *упарадкаваны* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***у-***; аднакаранёвыя словы: *парадкаваць*, *парадак* | Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Марфемы як структурна значымыя часткі слова | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 24–26.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 23, 25 |
| **А9.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (вагон) цыстэрна;<br>2) (Корш) Саблін;<br>3) (інфра) структура;<br>4) (паў) яблыка; | 1) *вагон-цыстэрна* → складаны назоўнік, утвораны ад двух самастойных слоў ***вагон*** і ***цыстэрна*** без злучальнай галоснай, пішацца праз злучок;<br>2) *Корш-Саблін* → складаны назоўнік, які | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 5) (птушка) гадоўля.<br><br>**Адказ:** 1,2 | абазначае састаўное прозвішча, пішацца праз злучок;<br>3) *інфраструктура* → складаны назоўнік з першай іншамоўнай часткай ***інфра***- пішацца разам;<br>4) *паўяблыка* → частка ***паў***- з агульным назоўнікам пішацца разам;<br>5) *птушкагадоўля* → складаны назоўнік, утвораны шляхам спалучэння дзвюх асноў ***птушк***- і ***гадоўл***- з дапамогай злучальнай літары ***а***, пішацца разам | правапіс | 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 27.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А10.** Адзначце правільна напісаныя лічэбнікі:<br>1) восемь;<br>2) шэсцьдзясят;<br>3) дзве;<br>4) пятнадцаты;<br>5) чацвёра.<br><br>**Адказ:** 2,3,5 | 1) *восем* → пасля губнога гука [***м***] *мяккі знак* не пішацца;<br>2) *шэсцьдзясят* → лічэбнік напісаны правільна;<br>3) *дзве* → лічэбнік напісаны правільна;<br>4) *пятнаццаты* → у сярэдзіне лічэбніка ***пятнаццаты*** пішуцца дзве літары ***ц*** (***цц***);<br>5) *чацвёра* → лічэбнік напісаны правільна | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46, 47, 49.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 33, 34 |
| **А11.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (густа) валосы;<br>2) (літаратурна) музычны;<br>3) (паўднёва) ўсходні;<br>4) (трох) пакаёвы;<br>5) (анты) мікробны.<br><br>**Адказ:** 2,3 | 1) *густавалосы* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***густыя валасы***), пішацца разам;<br>2) *літаратурна-музычны* → складаны прыметнік, утвораны ад двух раўназначных слоў (***літаратурны*** і ***музычны***), пішацца праз злучок;<br>3) *паўднёва-ўсходні* → складаны прыметнік, які абазначае напрамак свету, пішацца праз злучок;<br>4) *трохпакаёвы* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***тры пакоі***), пішацца разам;<br>5) *антымікробны* → складаны прыметнік з першай іншамоўнай часткай ***анты***- | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс складаных прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. |



УА "РІКВ"

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | пішацца разам | | Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А12.** Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак -***эш*** (-***еш***):<br>1) радавацца;<br>2) падкрэсліць;<br>3) сказаць;<br>4) падстрыгчы;<br>5) задрыжаць.<br><br>**Адказ:** 1,4 | 1) *радавацца – радуешся* → зваротны дзеяслоў І спражэння незакончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу пасля асновы на мяккі зычны гук (*раду[йэ]шся*) мае канчатак -***еш***- (-***ся*** *– постфікс*);<br>2) *падкрэсліць – падкрэсліш* → дзеяслоў ІІ спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на мяккі зычны гук мае канчатак -***іш***;<br>3) *сказаць – скажаш* → дзеяслоў І спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук [***ж***] не пад націскам мае канчатак -***аш***;<br>4) *падстрыгчы – падстрыжэ́ш* → дзеяслоў І спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук [***ж***] пад націскам мае канчатак -***эш***;<br>5) *задрыжаць – задрыжыш* → дзеяслоў ІІ спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае канчатак -***ыш*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Трыванне дзеяслова. Утварэнне дзеясловаў закончанага і незакончанага трыванняў. Канчаткі дзеясловаў І і ІІ спражэнняў, іх правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 61, 65.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; практ. 320; § 38 |
| **А13.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:<br>1) вывучыць (***на***) ***памяць***;<br>2) сустракацца (***што***) ***год***;<br>3) чытаць (***па***) ***нямецку***;<br>4) расчыніць (***на***) ***сцеж***;<br>5) (***за***) ***надта*** прыгожы.<br><br>**Адказ:** 2,4,5 | 1) *вывучыць* ***на памяць*** → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне назоўніка з прыназоўнікам пішацца асобна;<br>2) *сустракацца* ***штогод*** → прыслоўе, утворанае шляхам спалучэння займенніка ***што*** і назоўніка ***год***, пішацца разам;<br>3) *чытаць* ***па-нямецку*** → прыслоўе, якое мае прыстаўку ***па-*** і заканчваецца на -***цку***, пішацца праз злучок;<br>4) *расчыніць* ***насцеж*** → прыслоўе, утворанае | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 27–30.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 19, 43; практ. 344 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | ад назоўніка, які ў сучаснай беларускай мове самастойна не ўжываецца, пішацца разам;<br>5) ***занадта*** *прыгожы* → прыслоўе, утворанае шляхам спалучэння прыслоўя ***надта*** і прыназоўніка ***за***, пішацца разам | | |
| **А14.** Адзначце прыклады, у якіх часціцу ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць разам:<br>1) (***не***) ***трымацца*** за мінулае;<br>2) (***не***) ***паседлівае*** дзіця;<br>3) яблыні (***не***) ***пабелены***;<br>4) (***не***) ***разлічваючы*** на дапамогу;<br>5) (***не***) ***прачытаны*** раман.<br><br>**Адказ:** 2,5 | 1) ***не трымацца*** *за мінулае* → ***не*** з дзеясловам пішацца асобна;<br>2) ***непаседлівае*** *дзіця* → ***не-*** – прыстаўка, без якой слова ***непаседлівае*** не ўжываецца;<br>3) *яблыні* ***не пабелены*** → ***не*** з кароткім дзеепрыметнікам пішацца асобна;<br>4) ***не разлічваючы*** *на дапамогу* → ***не*** з дзеепрыслоўем пішацца асобна;<br>5) ***непрачытаны*** *раман* → ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім няма залежнага слова, пішацца разам | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 42.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 12, 15, 47.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 5.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 48 |
| **А15.** Адзначце сказы, у якіх правільна ўжыта падкрэсленая часціца ***ні***:<br>1) Якая б ***ні*** была прыгожая тая ці іншая мова, але толькі адна завецца роднай.<br>2) ***Ні*** май сто рублёў, а май сто сяброў.<br>3) Вясной і ў людзей, і ў птушак ***ні*** хвілінкі вольнага часу.<br>4) ***Ні*** разу не пакрыўдзіла сяброў я сваёй абыякавасцю.<br>5) Ці ж ***ні*** пра дабро нагадвае нам горад Добруш!<br><br>**Адказ:** 1,3,4 | 1) *Якая б* ***ні*** *была прыгожая тая ці іншая мова, але толькі адна завецца роднай.* → у дадзенай частцы складаназалежнага сказа для ўзмацнення сцвярджэння ўжываецца часціца ***ні***;<br>2) ***Не*** *май сто рублёў, а май сто сяброў.* → для надання адмоўнага значэння частцы сказа пры дзеяслове-выказніку ўжываецца часціца ***не***;<br>3) *Вясной і ў людзей, і ў птушак* ***ні*** *хвілінкі вольнага часу.* → для надання адмоўнага значэння безасабоваму сказу ўжываецца | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 46.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; практ. 23.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | часціца ***ні***, якая стаіць пры назоўніку ***хвілінкі*** ў форме роднага склону;<br>4) ***Ні*** *разу не пакрыўдзіла сяброў я сваёй абыякавасцю.* → у спалучэнні ***ні разу*** са значэннем *'ніколі'* ўжываецца часціца ***ні***;<br>5) *Ці ж* ***не*** *пра дабро нагадвае нам горад Добруш!* → для надання сцвярджэння сказу пытальна-клічнага тыпу ўжываецца часціца ***не*** | | устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 47 |
| **А16.** Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) кіраўнік справамі;<br>2) хадзіць па сцежкам;<br>3) цешыцца з дзіцяці;<br>4) у пяці метрах ад возера;<br>5) наведваць у святочныя дні.<br><br>**Адказ:** 3,5 | 1) *кіраўнік спраў* → пры назоўніку ***кіраўнік*** залежнае слова ўжываецца ў форме роднага склону;<br>2) *хадзіць па сцежках* → у форме множнага ліку меснага склону назоўнік з асновай на зычны гук [***к***] мае канчатак ***-ах***;<br>3) *цешыцца з дзіцяці* → дзеяслоў ***цешыцца*** кіруе назоўнікам у форме роднага склону з прыназоўнікам ***з***;<br>4) *за пяць метраў ад возера* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя;<br>5) *наведваць у святочныя дні* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення.<br>Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка.<br>Асаблівасці кіравання ў беларускай мове | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 8; практ. 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; практ. 277.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9; С. 242–244 |
| **А17.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленае (выдзеленыя) слова (словы) – ***акалічнасць***:<br>1) Вызваліць ***хутка*** вясна ад зімовых чараў рэчку.<br>2) Ідзём з дзядулем мы ў заснежаны лес сляды-загадкі ***разгадаць***.<br>3) У кожнага на душы ***радасна***, калі вяртаюцца з выраю жаваранкі.<br>4) ***Адгарадзіўшы дзень ад нас чарнільнай шырмай***, ноч апусцілася павольна на зямлю.<br>5) ***Хоць*** валошка і лічыцца пустазеллем, але ніхто не асмеліцца так яе назваць.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) *Вызваліць хутка вясна ад зімовых чараў рэчку.* → прыслоўе ***хутка*** адносіцца да дзеяслова-выказніка ***вызваліць***, адказвае на пытанне *калі?* і з'яўляецца акалічнасцю;<br>2) *Ідзём з дзядулем мы ў заснежаны лес сляды-загадкі разгадаць.* → інфінітыў ***разгадаць*** адносіцца да дзеяслова-выказніка ***ідзём***, адказвае на пытанне *з якой мэтай?* і з'яўляецца акалічнасцю;<br>3) *У кожнага на душы радасна, калі вяртаюцца з выраю жаваранкі.* → у галоўнай частцы складаназалежнага сказа дзейніка няма; выказнік выражаны прыслоўем са значэннем стану ***радасна***; | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Галоўныя і даданыя члены сказа. Спосабы выражэння галоўных і даданых членаў сказа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў двух частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 17.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 56.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 4) *Адгарадзіўшы дзень ад нас чарнільнай шырмай, ноч апусцілася павольна на зямлю.* → дзееприслоўны зварот з'яўляецца акалічнасцю;<br>5) *Хоць валошка і лічыцца пустазеллем, але ніхто не асмеліцца так яе назваць.* → ***хоць*** – падпарадкавальны злучнік, пры дапамозе якога ў складаназалежным сказе даданая акалічнасная ўступальная частка звязана з галоўнай часткай | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 16, 20, 42.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 19, 25 |
| **А18.** Адзначце аднасастаўныя сказы:<br>1) Добра ма́рыцца ў асеннім лесе.<br>2) Матэрыяльнае не павінна браць верх над духоўным.<br>3) Праца – гэта аснова жыцця.<br>4) Лес на ласункі багаты.<br>5) Беражы нос у вялікі мароз.<br><br>**Адказ:** 1,5 | 1) *Добра ма́рыцца ў асеннім лесе.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік выражаны спалучэннем прыслоўя з безасабовым дзеясловам;<br>2) *Матэрыяльнае не павінна браць верх над духоўным.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны прыметнікам, ужытым у значэнні назоўніка; у састаўным дзеяслоўным выказніку лексічнае значэнне выражана фразеалагізмам ***браць верх***, граматычнае – прыметнікам ***павінна*** + часціца ***не***;<br>3) *Праца – гэта аснова жыцця.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; выказнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону + часціца ***гэта***;<br>4) *Лес на ласункі багаты.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; у састаўным іменным выказніку дзеяслоў-звязка адсутнічае (нулявая звязка), іменная частка выражана прыметнікам;<br>5) *Беражы нос у вялікі мароз.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік выражаны дзеясловам загаднага ладу ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення.<br>Двухсастаўныя сказы.<br>Аднасастаўныя сказы, іх будова | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 15–19, 27–31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |
| **А19.** Адзначце сказы, у якіх працяжнік паміж | 1) *Белыя азёры, мабыць, самы прыгожы* | Сінтаксіс і | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| дзейнікам і выказнікам пастаўлены ў адпаведнасці з правіламі пунктуацыі беларускай мовы:<br>1) Белыя азёры, мабыць, – самы прыгожы куток Брэстчыны.<br>2) Дзетак узгадаваць – не грыбкоў назбіраць.<br>3) Рака Нёман за Прыпяць – даўжэйшая.<br>4) Вёрткая сінічка – пырх з галінкі на другую.<br>5) Індыя – радзіма шахмат.<br><br>**Адказ:** 2,4,5 | *куток Брэстчыны.* → паміж дзейнікам, выражаным сінтаксічна непадзельным словазлучэннем, і выказнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, ёсць пабочнае слова ***мабыць***, таму працяжнік ***не ставіцца***;<br>2) *Дзетак узгадаваць* **–** *не грыбкоў назбіраць.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі інфінітывамі, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>3) *Рака Нёман за Прыпяць даўжэйшая.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным прыметнікам у форме вышэйшай ступені параўнання, працяжнік ***не ставіцца***;<br>4) *Вёрткая сінічка* **–** *пырх з галінкі на другую.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным усечанай формай дзеяслова, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>5) *Індыя* **–** *радзіма шахмат.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік | пунктуацыя. Культура маўлення. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 12.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 21 |
| **А20.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Полем, і лугам, і пералескамі красавік ідзе да нас з пралескамі.<br>2) У спеве жулана можна пачуць стракатанне сарокі і цвырканне вераб'я, меладычны свіст івалгі і хрыплае карканне вароны.<br>3) Пахне чэрвеньскі ветрык то суніцамі, то мядовай грэчкай.<br>4) Ад жоўтай лотаці берагі рэк, ды каналаў становяцца сонечнымі.<br>5) Што мне свет наш вялікі без маленькай, | 1) *Полем, і лугам, і пералескамі красавік ідзе да нас з пралескамі.* → коскамі раздзяляюцца аднародныя акалічнасці, звязаныя паўторным спалучальным злучнікам ***і***;<br>2) *У спеве жулана можна пачуць стракатанне сарокі і цвырканне вераб'я, меладычны свіст івалгі і хрыплае карканне вароны.* → аднародныя дапаўненні, звязаныя парамі пры дапамозе злучнікаў ***і***, коскамі не раздзяляюцца; пары аднародных дапаўненняў, звязаныя | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 19.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37–40.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| роднай вёскі!<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | бяззлучнікавай сувяззю, раздзяляюцца коскамі;<br>3) *Пахне чэрвеньскі ветрык то суніцамі, то мядовай грэчкай.* → паміж аднароднымі дапаўненнямі, звязанымі пры дапамозе размеркавальнага злучніка ***то – то***, ставіцца коска;<br>4) *Ад жоўтай лотаці берагі рэк ды каналаў становяцца сонечнымі.* → паміж аднароднымі азначэннямі, звязанымі пры дапамозе адзіночнага спалучальнага злучніка ***ды*** (= ***і***), коска не ставіцца;<br>5) *Што мне свет наш вялікі без маленькай роднай вёскі!* → паміж неаднароднымі азначэннямі, выражанымі якаснымі прыметнікамі, якія адносяцца да паяснёнага назоўніка па-рознаму (прыметнік ***роднай*** адносіцца непасрэдна да назоўніка ***вёскі***, прыметнік ***маленькай*** – да словазлучэння ***роднай вёскі***), коска не ставіцца | | вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 12; практ. 99, 100, 104 |
| **А21.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Прыгожа__ быццам да шлюбу__ снег з марозам прыбралі бярозу.<br>2) Няхай заўжды ў нас квітнеюць смолкі, званочкі і сінія__ што неба__ васілёчкі.<br>3) Першапачаткова надзіманыя шарыкі выкарыстоўваліся ў Англіі__ як афіцыйны атрыбут святочных шэсцяў, юбілейных свят і свецкіх прыёмаў.<br>4) Зіма сёлета__ як на заказ.<br>5) Нібы дзеці__ плачуць у асеннім небе гусі.<br><br>**Адказ:** 1,2,5 | 1) *Прыгожа**,** быццам да шлюбу**,** снег з марозам прыбралі бярозу.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***быццам да шлюбу***; ***быццам*** – параўнальны злучнік;<br>2) *Няхай заўжды ў нас квітнеюць смолкі, званочкі і сінія**,** што неба**,** васілёчкі.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***што неба***; ***што*** – параўнальны злучнік;<br>3) *Першапачаткова надзіманыя шарыкі выкарыстоўваліся ў Англіі як афіцыйны атрыбут святочных шэсцяў, юбілейных свят і свецкіх прыёмаў.* → не аддзяляецца коскай зварот ***як афіцыйны атрыбут святочных шэсцяў, юбілейных свят і свецкіх прыёмаў***, які мае значэнне ‘ў якасці’ (*шарыкі* і былі *афіцыйным атрыбутам святочных шэсцяў,* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 52, 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | *юбілейных свят і свецкіх прыёмаў*);<br>4) *Зіма сёлета як на заказ.* → не аддзяляецца коскай фразеалагізм ***як на заказ***;<br>5) *Нібы дзеці**,** плачуць у асеннім небе гусі.* → аддзяляецца коскай параўнальны зварот ***нібы дзеці***; ***нібы*** – параўнальны злучнік | | |
| **А22.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Пасаджаны некалі ўсёй вёскай__ зацвіў сёлета рабінавы гай.<br>2) Каб восенню добры ўраджай атрымаць, нельга вясной__ спусціўшы рукавы__ працаваць.<br>3) Закончыўшы вясновы рамонт сваіх гнёздаў__ клякочуць задаволена буслы.<br>4) Сніць лес зімою завірушнай__ поўныя ягад__ паляны, россып кветак, пералівы птушыных галасоў.<br>5) У Беларусі сустракаецца 8 відаў зверабою__ ці святаянніку.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *Пасаджаны некалі ўсёй вёскай**,** зацвіў сёлета рабінавы гай.* → коскай аддзяляецца адасобленае дапасаванае азначэнне ***Пасаджаны некалі ўсёй вёскай***, якое стаіць перад паяснёным назоўнікам ***гай*** і аддзелена ад яго іншымі членамі сказа;<br>2) *Каб восенню добры ўраджай атрымаць, нельга вясной спусціўшы рукавы працаваць.* → коскамі не выдзяляецца акалічнасць ***спусціўшы рукавы***, якая з'яўляецца фразеалагізмам;<br>3) *Закончыўшы вясновы рамонт сваіх гнёздаў**,** клякочуць задаволена буслы.* → аддзяляецца коскай адасобленая акалічнасць ***Закончыўшы вясновы рамонт сваіх гнёздаў***, выражаная дзеепрыслоўным зваротам;<br>4) *Сніць лес зімою завірушнай поўныя ягад паляны, россып кветак, пералівы птушыных галасоў.* → не выдзяляецца коскамі дапасаванае азначэнне ***поўныя ягад***, якое выражана прыметнікавым зваротам і стаіць перад паяснёным назоўнікам ***паляны***;<br>5) *У Беларусі сустракаецца 8 відаў зверабою**,** ці святаянніку.* → аддзяляецца коскай адасоблены прыдатак ***ці святаянніку***, пры якім ёсць злучнік ***ці*** і які мае ўдакладняльнае значэнне | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 16.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46–50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |
| **А23.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі): | 1) *Бабры здольныя праплысці пад вадой амаль 800 метраў.* → часціца ***амаль*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент змесцу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 1) Бабры здольныя праплысці пад вадой__ амаль__ 800 метраў.<br>2) Добры сняжок__ між іншым__ ураджай зберагае.<br>3) Сумленны чалавек__ кажуць у народзе__ спакойна спаць кладзецца.<br>4) Будаўніцтва новай хаты__ дарэчы__ нашы продкі распачыналі ў аўторак або ў чацвер.<br>5) Герань – пакаёвая расліна, аднак__ яна можа расці і ў садзе.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | коскамі не выдзяляецца;<br>2) *Добры сняжок, між іншым, ураджай зберагае.* → спалучэнне слоў ***між іншым***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, указвае на парадак думак і іх сувязь, з'яўляецца пабочным; пабочная канструкцыя выдзяляецца коскамі;<br>3) *Сумленны чалавек, кажуць у народзе, спакойна спаць кладзецца.* → сказ ***кажуць у народзе***, які граматычна не звязаны з членамі сказа, не дзеліцца па членах сказа і ўказвае на крыніцу паведамлення, з'яўляецца пабочным; пабочны сказ выдзяляецца коскамі;<br>4) *Будаўніцтва новай хаты, дарэчы, нашы продкі распачыналі ў аўторак або ў чацвер.* → слова ***дарэчы***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, указвае на парадак думак і іх сувязь, з'яўляецца пабочным; пабочнае слова выдзяляецца коскамі;<br>5) *Герань – пакаёвая расліна, аднак яна можа расці і ў садзе.* → не аддзяляецца коскай супраціўны злучнік ***аднак*** | маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |
| **А24.** Адзначце складаназлучаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць коску:<br>1) Яшчэ дзень-два і скрозь пабягуць ручайкі.<br>2) Ягады рабіны, шыпшыны, каліны, ядлоўцу склёўваюць амялушкі а шышкі елкі і сасны лушчаць крыжадзюбы.<br>3) Спакойнае неба чаруе бяздонным блакітам і так прыгожа, так міла серабрыцца ля рэчкі густая ракіта.<br>4) Ужо зноў кукуюць зязюлі і росы мядовыя ападаюць на дол.<br>5) Не маем мы вялікага мора затое ёсць у нас чароўныя азёры. | 1) *Яшчэ дзень-два* **–** *і скрозь пабягуць ручайкі.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія паказваюць на хуткую змену падзей і звязаны спалучальным злучнікам ***і***, ставіцца працяжнік;<br>2) *Ягады рабіны, шыпшыны, каліны, ядлоўцу склёўваюць амялушкі****,*** *а шышкі елкі і сасны лушчаць крыжадзюбы.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з супастаўляльнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***а*** ставіцца коска;<br>3) *Спакойнае неба чаруе бяздонным* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 6–11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 16 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** 2,3,5 | *блакітам**,** і так прыгожа, так міла серабрыцца ля рэчкі густая ракіта.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** ставіцца коска;<br>4) *Ужо зноў кукуюць зязюлі і росы мядовыя ападаюць на дол.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца, бо ў першай частцы ёсць агульныя для абедзвюх частак словы ***Ужо зноў***;<br>5) *Не маем мы вялікага мора**,** затое ёсць у нас чароўныя азёры.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з супастаўляльнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***затое*** ставіцца коска | | |
| **А25.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Там ніва не родзіць, дзе гультай ходзіць.<br>2) Каб бярозавік быў смачнейшы, бочку з сокам закопвалі на шэсць дзён у пясок.<br>3) Люблю часіну першых навальніц, калі вясёлая маланка зіхаціць, і калі нясмела яшчэ гром грыміць.<br>4) Сушэнне сыру, якое дазваляе надоўга захаваць гэты малочны прадукт мае ў нас даўнюю традыцыю.<br>5) Чуў я, што, калі на Стрэчанне раніцай выпадзе снег, то трэба чакаць ранняга ўраджаю.<br><br>**Адказ:** 1,2 | 1) *Там ніва не родзіць, дзе гультай ходзіць.* → складаназалежны сказ, у якім даданая акалічнасная частка, што звязана з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова ***дзе***, аддзяляецца коскай;<br>2) *Каб бярозавік быў смачнейшы, бочку з сокам закопвалі на шэсць дзён у пясок.* → складаназалежны сказ, у якім даданая акалічнасная частка, што звязана з галоўнай пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ***каб***, аддзяляецца коскай;<br>3) *Люблю часіну першых навальніц, калі вясёлая маланка зіхаціць і калі нясмела яшчэ гром грыміць.* → сказ з дзвюма даданымі азначальнымі часткамі, якія паясняюць у галоўнай назоўнік ***часіну***, адказваюць на адно і тое ж пытанне *якую?* і з'яўляюцца аднароднымі; паміж | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 13–21, 23, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | аднароднымі дадзенымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коска не ставіцца;<br>4) *Сушэнне сыру, якое дазваляе надоўга захаваць гэты малочны прадукт**,** мае ў нас даўнюю традыцыю.* → складаназалежны сказ, у якім даданая азначальная частка, што звязана з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова ***якое***, выдзяляецца коскамі;<br>5) *Чуў я, што калі на Стрэчанне раніцай выпадзе снег, то трэба чакаць ранняга ўраджаю.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, дзе паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач, коска не ставіцца, бо ёсць другая частка ***то*** парнага злучніка ***калі – то*** | | |
| **А26.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць двукроп'е:<br>1) Даспяваюць суніцы ў зялёных барах звіняць на шыпшыне пчаліныя гуслі.<br>2) Балоты з'яўляюцца выдатнымі біялагічнымі фільтрамі яны паглынаюць і перапрацоўваюць бактэрыяльную і грыбковую мікрафлору.<br>3) Убачыць зблізку жураўлёў складана птушкі гэтыя жывуць на балотах.<br>4) Ліпа зацвіла ля нашай хаты тут жа прыляцеў і чмель пухнаты.<br>5) Няма вясною камароў летам дрэнны ўкос будзе.<br><br>**Адказ:** 2,3 | 1) *Даспяваюць суніцы ў зялёных барах**,** звіняць на шыпшыне пчаліныя гуслі.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца коска, бо ў іх выражаюцца адносіны адначасовасці з'яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (= ***і***);<br>2) *Балоты з'яўляюцца выдатнымі біялагічнымі фільтрамі**:** яны паглынаюць і перапрацоўваюць бактэрыяльную і грыбковую мікрафлору.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо ў другой частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>3) *Убачыць зблізку жураўлёў складана**:** птушкі гэтыя жывуць на балотах.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо ў | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 26–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 18 |

| **Заданне.**<br>**Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| | другой часткі ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>4) *Ліпа зацвіла ля нашай хаты* **–** *тут жа прыляцеў і чмель пухнаты.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо паміж імі выражаецца хуткая змена падзей;<br>5) *Няма вясною камароў* **–** *летам дрэнны ўкос будзе.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо першая частка паказвае на ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой частцы; у пачатку першай часткі можна паставіць злучнік ***калі*** | | |
| **А27.** Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць складанаму сказу з рознымі відамі сувязі частак:<br><br>*На свята Багач усе вяскоўцы нездарма завіталі ў хату майго суседа гаспадару які шчыра працаваў і які сабраў лепшы ўраджай урачыста прыносяць у нашай вёсцы апошні сноп жыта.*<br><br>1) у сказе прапушчаны тры коскі;<br>2) у сказе прапушчаны працяжнік;<br>3) у сказе пастаўлены ўсе неабходныя знакі прыпынку;<br>4) у сказе прапушчана двукроп'е;<br>5) у сказе прапушчаны дзве коскі.<br><br>**Адказ:** 4,5 | **І** [1]*На свята Багач усе вяскоўцы нездарма завіталі ў хату майго суседа****:*** **ІІ** [2]*гаспадару****,*** [3]*які шчыра працаваў і* [4]*які сабраў лепшы ўраджай****,*** [2]*урачыста прыносяць у нашай вёсцы апошні сноп жыта.* → сказу адпавядаюць наступныя сцверджанні:<br>1) сцверджанне пад нумарам **4**: паміж **І** і **ІІ** сэнсавымі часткамі ставіцца двукроп'е, бо яны звязаны бяззлучнікавай сувяззю і ў **ІІ** частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў **І**; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>2) сцверджанне пад нумарам **5**: у **ІІ** сэнсавай частцы аднародныя даданыя часткі **3** і **4**, якія стаяць у сярэдзіне галоўнай **2**, выдзяляюцца з двух бакоў коскамі.<br>Паміж аднароднымі даданымі часткамі **3** і **4**, звязанымі спалучальным злучнікам ***і***, коска не ставіцца | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 31, 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А28.** Адзначце знак (знакі) прыпынку, які (якія) трэба паставіць на месцы пропуску ў сказе:<br>*Мой сусед, заўзяты рыбак, расказваў__ «Вугор у росныя ночы выпаўзае на поле, каб паесці гароху».*<br>1) кропку і працяжнік;<br>2) коску і працяжнік;<br>3) двукроп'е;<br>4) працяжнік;<br>5) кропку.<br>**Адказ:** 3 | *Мой сусед, заўзяты рыбак, расказваў: «Вугор у росныя ночы выпаўзае на поле, каб паесці гароху».* → сказ з простай мовай, у якім:<br>1) словы аўтара стаяць перад простай мовай; пасля слоў аўтара трэба паставіць *двукроп'е* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 23.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 35, 36.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |

**Тэкст да заданняў А29, А30, В1–В6**

(1) *Вызначэнне словаўтваральнай структуры – гэта свайго роду этымалагічны аналіз.* (2) *Вызначэнне словаўтваральнай будовы прадугледжвае наступныя этапы: вылучаецца група вытворных слоў, выдзяляецца іх корань.* (3) *Знайсці корань можна,* **...** *гісторыю слова.* (4) [1]*Выдзеліўшы* [2]*першасны корань, можна ўбачыць, што* ***само*** *слова* [3]*азначала раней, калі, чаму і якія* [4]*адбыліся ў ім* [5]*змены.*

(5) *Возьмем словы, якія ў беларускай мове абазначаюць зімовае надвор'е: замець, мяцеліца, завея, завіруха.* (6) *Мяцеліца – старажытнае слова.* (7) *Яго ўзнікненне трэба* ***звязаць*** *з дзеясловам «месці».* (8) *Блізкім па значэнні да назвы «мяцеліца» з'яўляецца назоўнік «завея».* (9) *Дадзены назоўнік аддзеяслоўны, утвораны на базе прэфіксальнага «завеяць».* (10) *Назва «мяцеліца» падкрэслівае, што* ***снег*** *уздымаецца, мяцецца.* (11) *«Завея» звязваецца з веяннем, насыпаннем снежных гурбаў.* (12) *Назоўнік «завіруха» мае сувязь са словамі «вір», «віраваць», «вірыць».* (13) *Акрамя таго, назоўнік «завіруха» ў беларускай мове з даўніх часоў ужываецца ў пераносным значэнні – «неспакой, бязладдзіца».*

(14) *Падставай для таго, каб у беларускай мове назваць зімовыя месяцы «снежнем», «студзенем», «лютым», паслужылі прыродныя з'явы: снег, сцюжа, люты (****вялікі****, моцны) мароз.*

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А29.** Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту:<br>1) тэкст навуковага стылю;<br>2) тэкст мастацкага стылю;<br>3) тэкст гутарковага стылю;<br>4) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>5) тэкст афіцыйнага стылю.<br>**Адказ:** 1 | тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам **1**: тэкст ***навуковага стылю***, таму што:<br>1) галоўная функцыя тэксту – перадача навуковай інфармацыі;<br>2) выклад зместу падкрэслена лагічны (паслядоўны, звязны);<br>3) выказванне інфармацыйна насычанае, пры гэтым сціслае, дакладнае, канкрэтнае;<br>4) ужываецца спецыяльная лексіка: | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | *словаўтваральнай структуры, этымалагічны аналіз, вытворных слоў* і г. д.;<br>5) уяўляе сабой параграф падручніка ці ўрывак з даклада, навуковага артыкула і пад. | | ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 13, 57.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 10, 11, 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 4–8 |
| **А30.** Адзначце словы, якія могуць быць ужыты на месцы пропуску ў ***3-м*** сказе тэксту:<br>1) адчуўшы;<br>2) высветліўшы;<br>3) здолеўшы;<br>4) ажыццявіўшы;<br>5) вызначыўшы.<br><br>**Адказ:** 2,5 | на месцы пропуску ў ***3-м*** сказе тэксту могуць быць ужыты словы-сінонімы ***высветліўшы*** і ***вызначыўшы***:<br>1) *высветліўшы*: (3) *Знайсці корань можна, высветліўшы гісторыю слова.*;<br>2) *вызначыўшы*: (3) *Знайсці корань можна, вызначыўшы гісторыю слова.* | Маўленне. Тэкст. Стылістыка.<br>Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 16.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 2, 26. |



УА"РІКВ"

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 9, 21.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 2 |
| **В1.** З пранумараваных у ***4-м*** сказе тэксту слоў вызначце тое, у якім ёсць асіміляцыя зычных гукаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***4-м*** сказе.<br><br>**Адказ:** змены | 1) *змены* → цвёрды свісцячы зычны гук [***з***] прыпадабняецца да мяккага зычнага [***м’***] і вымаўляецца як мяккі [***з’***]: [***з’м’эны***];<br>2) прыпадабненне цвёрдага зычнага гука да мяккага зычнага называецца асіміляцыяй зычных гукаў па мяккасці | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Арфаэпічныя нормы: нормы беларускага літаратурнага вымаўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 3.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |
| **В2.** Запішыце падкрэслены ў ***10-м*** сказе тэксту назоўнік у форме роднага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** снегу | 1) *снегу* → рэчыўны назоўнік 2-га скланення мужчынскага роду ***снег***, які абазначае з’яву прыроды, у форме роднага склону адзіночнага ліку мае канчатак ***-у*** | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Назоўнікі 2-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 18.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 29 |
| **В3.** Запішыце падкрэслены ў ***14-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону множнага ліку.<br><br>**Адказ:** вялікія | 1) *вялікія* → прыметнік з асновай на мяккі зычны гук у форме назоўнага склону множнага ліку мае канчатак ***-ія*** | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Скланенне якасных прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 35.<br>**.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа |



УАЦДКВ

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 32 |
| **В4.** Запішыце падкрэслены ў ***4-м*** сказе тэксту займеннік у форме давальнага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** самому | 1) *самому* → пры скланенні азначальнага займенніка ***само́*** націск падае на канчатак: ***само́му*** | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Скланенне і правапіс займеннікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 53.<br>**.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 36 |
| **В5.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў ***7-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** звязаны | 1) *звязаны* → ад асновы неазначальнай формы дзеяслова закончанага трывання ***звязаць*** з дапамогай суфікса ***-н-*** утвараецца поўны дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу ***звязаны*** | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 8, 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 40 |
| **В6.** У адным са сказаў ***10–14*** тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘***прычына, абставіны, якія з’яўляюцца асновай для чаго-небудзь***’. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў адным са сказаў ***10–14***.<br><br>**Адказ:** падставай | 1) *падставай* → лексічнае значэнне ‘*прычына, абставіны, якія з’яўляюцца асновай для чаго-небудзь*’ мае ўжытае ў ***14-м*** сказе тэксту слова ***падстава*** (*падставай*) | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Слова, яго лексічнае значэнне | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў двух частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 20 |



УА "РІКВ"

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **В7.** Знайдзіце ў прапанаваным сказе немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў сказе:<br>*Нашы лясы, у якіх ёсць вялікая колькасць корму і сховішчаў, славяцца багатай жывёльнай фаўнай.*<br><br>**Адказ:** жывёльнай | 1) *жывёльнай* → ужытае ў сказе слова ***фаўна*** (*фаўнай*) мае значэнне ‘*сукупнасць усіх відаў жывёл пэўнай мясцовасці ці геалагічнага перыяду*’, таму слова ***жывёльнай*** у прапанаваным сказе збыткоўнае | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 1.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 2 |

**В8.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку і ***супрацьлеглымі*** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Адпускаць лейцы.<br>**Б.** Іграць другую скрыпку.<br>**В.** Станавіцца папярок дарогі.<br>**Г.** Не пакладаючы рук. | **1.** Весці рэй.<br>**2.** Сыходзіць з дарогі.<br>**3.** Абы дзень адбыць.<br>**4.** Закручваць гайкі.<br>**5.** Дарогі разышліся. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А4Б1В2Г3 | 1) *адпускаць лейцы* – ‘змяншаць кантроль, паслабляць увагу, пільнасць, патрабаванні да каго-небудзь’ → *закручваць гайкі* – ‘павышаць патрабаванні да каго-небудзь, узмацняць строгасць’;<br>2) *іграць другую скрыпку* – ‘займаць другараднае, падпарадкаванае становішча ў чым-небудзь’ → *весці рэй* – ‘быць завадатарам, верхаводзіць, аказваць уплыў на ход чаго-небудзь’;<br>3) *станавіцца папярок дарогі* – ‘знарок перашкаджаць каму-небудзь’ → *сыходзіць з дарогі* – ‘перастаўшы перашкаджаць, даваць магчымасць дзейнічаць іншым’;<br>4) *не пакладаючы рук* – ‘вельмі старанна’ → *абы дзень адбыць* – ‘як папала, без ахвоты і старання’ | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 22.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 22 |

УАДІКВ

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td colspan="4">В9. Вызначце, якімі часцінамі мовы з’яўляюцца падкрэсленыя ў сказах словы, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br>А. Ёсць у Вязынцы хата, і да хаты <u>гэтай</u> сцежка не зарастае: нарадзіўся тут Янка Купала.<br>Б. Ляцяць лісты і павуціна <u>ўслед</u> жураўлінаму кліну.<br>В. Ручнікі ў нас калісьці аздаблялі вышыўкай <u>або</u> карункамі.<br>Г. <u>Ці</u> ж можна, не шукаючы, знайсці?<br><br>1. Прыслоўе.<br>2. Часціца.<br>3. Займеннік.<br>4. Злучнік.<br>5. Прыназоўнік.</td></tr>
<tr><td>Адказ: А3Б5В4Г2</td><td>1) гэтай → указальны займеннік, які паказвае на прадмет (да хаты), што вылучаецца з ліку іншых;<br>2) услед → вытворны прыназоўнік, які стаіць перад назоўнікам кліну ў форме давальнага склону і мае значэнне ‘ў напрамку таго, што аддаляецца’;<br>3) або → размеркавальны злучнік, пры дапамозе якога звязаны аднародныя акалічнасці;<br>4) ці → пытальная часціца, якая ўзмацняе пытальны характар выказвання</td><td>Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Самастойныя і службовыя часціны мовы</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 50.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 35, 41, 43, 44.<br>З.І. Бадзевіч і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 4.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 35, 44, 45</td></tr>
</table>

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td colspan="4">В10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br><table><tr><td>А. Уласцівасць.<br>Б. ВКЛ.<br>В. Прырэчны.<br>Г. Загад.</td><td>1. Бяссуфіксны.<br>2. Літарная абрэвіяцыя.<br>3. Гукавая абрэвіяцыя.<br>4. Суфіксальны.<br>5. Прыставачна-суфіксальны.</td></tr></table></td></tr>
<tr><td>Адказ: А4Б2В5Г1</td><td>1) уласцівасць → слова ўтворана суфіксальным спосабам: уласців-(ы) + суфікс -асць;<br>2) ВКЛ → літарная абрэвіяцыя: слова ўтворана з пачатковых літар слоў Вялікае Княства Літоўскае; вымаўляецца [вэкаэл];<br>3) прырэчны → слова ўтворана прыставачна-суфіксальным спосабам: рак-(а) + прыстаўка пры- і суфікс -н-;<br>4) загад → слова ўтворана бяссуфіксным спосабам: загад/а/-(ць) + Ø (нулявы суфікс)</td><td>Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Асноўныя спосабы ўтварэння слоў</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 31, 32, 34.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 24, 37.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 23, 25, 26</td></tr>
</table>